# ФУНКЦЫІ ГРАФІЧНЫХ СРОДКАЎ У ПАЭТЫЧНЫХ ТЭКСТАХ АЛЕСЯ РАЗАНАВА

**В. А. Данько**

*Установа адукацыіі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», г. Мінск*

Навуковы кіраўнік В. У. Русак, канд. філал. навук, дацэнт

Экспрэсіўнасць як камунікатыўная якасць мае моўныя (лінгвістычныя) і пазамоўныя (экстралінгвістычныя) спосабы рэалізацыі. У пісьмовым маўленні крыніцай выразнасці, сродкам экцэнтуацыі ўвагі чытача на пэўным моманце можа выступаць графічнае афармленне. У апошні час некаторыя даследчыкі нават характарызуюць тэкст «як прасторавае графічнае рашэнне» [1], [5]. І сапраўды, у вершаваных творах многіх сучасных пісьменнікаў можна заўважыць прыклады новага графічнага афармлення тэксту, арыгінальна выкарыстаныя традыцыйныя графічныя сродкі, а таксама адступленні ад графічнай нормы набываюць новы сэнс і становяцца раўнапраўнымі элементамі выказвання.

Мэта нашага даследавання заключалася ў аналізе графічных сродкаў экспрэсіі ў вершах паэта-наватара, эксперыментатара Алеся Разанава. Прадметам даследавання сталі паэтычныя тэксты са зборнікаў розных гадоў выдання, а іменна «Назаўжды» (1974), «Шлях-360» (1981), «Рэчаіснасць» (1998).

У паэтычных творах з названых зборнікаў звяртае на сябе ўвагу такі графічны сродак акцэнтуацыі, як «**лесвіца слоў**»:

Чатыры крокі па кватэры:
праз ноч,
          няўтульнасць,
                    забыцце («*Адкрыцце*»);
аддаць усе, усе аддаць
і – неістотнаму самому –
хадзіць,
          смяяцца,
                    уздыхаць («*Шчасце*»);
Паўстань,
          распніся,
                    уваскрэсні
і немагчымае зрабі! («*Немагчымае*»).

Вынясенне слоў у асобныя радкі і размяшчэнне іх у выглядзе лесвіцы выкарыстоўваецца з прагматычнай мэтай: графічнае афармленне запавольвае тэмп, падказвае чытачу інтанацыю, з якой павінны быць агучаны вылучаныя паэтам словы.

Як правіла, А. Разанаў афармляе ў выглядзе лесвіцы аднародныя члены сказа:

Не адступаючы ні разу,
твары,
высноўвай
і палай!.. («*Немагчымае*»);
Распрастаешся ты на доле
па жыцці,
па бядзе,
па вайне… («*Балада пратэсту*»);
Людзі,
аблокі,
дрэвы,
з якімі ў мінулым растаўся («*Пунціры*»).

Аднак сустракаюцца прыклады, дзе ў выглядзе лесвіцы аформлены канструкцыі, члены якіх звязаны падпарадкавальнымі адносінамі:

Конаўку несла з вадою –
рукі
апалі
ў млосці («*Балада прыкметы*»).

У гэтым прыкладзе паўзы, якія ўзнікаюць паміж кампанентамі сказа, вынесенымі ў асобныя радкі, запавольваюць маўленне і тым самым дазваляюць аўтару перадаць эмацыянальны стан дзяўчыны, якая даведалася пра смерць каханага.

У некаторых выпадках лесвіца слоў спалучаецца са шматкроп'ем пасля кожнага слова, што, безумоўна, яшчэ больш экспрэсівізуе маўленне:

Аблога…
Крокі…
Ляск…
Прыцемненыя сцены («*Арышт Кастуся Каліноўскага*»);
вышэй?.. ніжэй?.. –
узняцца альбо ўпасці
мая…
ува мне…
са мною…
вышыня («*Пунціры*»).

Яшчэ адзін часты графічны сродак вылучэння і падкрэслівання асобных адрэзкаў звязнага маўлення ў А. Разанава – **вялікі міжрадковы інтэрвал**. Для таго каб засяродзіць увагу чытача на пэўнах словах, спалучэннях, фразах, аўтар размяшчае іх праз павялічаны міжрадковы інтэрвал, нібыта адрываючы ад астатняга тэксту:

Цяпер сцеражыся,
Каб не памерці
Раптам («*Гліна*»);
Імя,
Што прыйшло ад цябе,
Каб весці
Цяпер да цябе:

Усяслаў Чарадзей («*Усяслаў Чарадзей*»);
Памяць,
Якая нікому ўжо не належыць,
Але якой належаць

Усе («*Гліна*»).

У прааналізаваных творах А. Разанава назіраецца несістэмнае напісанне ў пачатку паэтычных радкоў **вялікай літары**. Так, ва ўсіх творах са зборніка «Назаўжды», у многіх творах са зборніка «Шлях-360», а таксама ў пункцірах са зборніка «Рэчаіснасць» аўтар адыходзіць ад традыцыйнага напісання першага слова паэтычнага радка з вялікай літары. Магчыма, пры напісанні вялікай літары ў пачатку кожнага радка тэксты набылі б звычайнае афармленне. Пазбягаючы традыцыйнасці запісу, аўтар не проста прэтэндуе на арыгінальнасць, але і мяркуе, што чытач убачыць і адчуе нявыказаны сэнс незвычайна пададзеных радкоў:

Калі мы проста былі знаёмыя –
было ўсе проста:
сустракаліся, як давядзецца,
гаварылі, што давядзецца,
так, пра клопат, пра дом, пра дарогу…
(*Калі мы проста былі знаёмыя…*);
Надломы – не яму надломы,
пярун – гэта не яму.
Ўздымацца дрэву маладому,
мацнець
праз лета і зіму («*Запавет*»).

Сустракаюцца ў прааналізаваных творах выпадкі, дзе графічным сродкам экспрэсіі выступае напісанне слоў (спалучэнняў, фраз) **прапіснымі літарамі** ў кантэксце радковых літар:

Што
ў гарачым
лісці
лікуе?!.
ТЫ НАЗВАЛАСЯ АМЯЛА...(«*Паэма гарачага лісця*»).

Словы (сказы, радкі), напісаныя вялікімі літарамі, успрымаюцца не толькі як эмацыянальна афарбаваныя, але і як носьбіты дадатковага сэнсу, спецыфічныя ўказальнікі наяўнасці імпліцытнай інфармацыі.

Дастаткова часта А. Разанаў выдзяляе словы, важныя для разумення кантэксту, пры дапамозе **разрадкі** (прабелаў паміж літарамі):

Калі я ўзыходзіў на вежу – в е ж а ю разважаў,
Калі ішоў па дарозе – д а р о г а ю бачыў...(«*Зоркі*»);
Так учынілася
І хіба
Можа ўчыніцца
Інакш т а к о е ? («*Усяслаў Чарадзей*»).

З экспрэсіўна-вылучальнай функцыяй у аўтарскім кантэксце выкарыстоўваецца таксама **курсіўны** і **тлусты шрыфт**:

Ачнуўся я…
Мне чуўся ціхі звон…
Я прахапіўся:
гэта быў *мой* горад,
далекі горад…(«*Першая паэма шляху*»);
Зблiжэння спробы…
І абаім нам кожны міг,
Наступны міг — міг **да асобы** («*Яшчэ ніхто*»).

Праведзенае даследаванне пацвердзіла тэзіс, што на візуальнае ўспрыняцце значны адбітак накладвае форма пададзенага матэрыялу. У паэтычным кантэксце А. Разанава выкарыстоўваюцца разнастайныя графічныя сродкі («лесвіца слоў», вялікі міжрадковы інтэрвал на фоне інтэрвала звычайнага памеру, напісанні слоў (спалучэнняў, фраз) прапіснымі літарамі ў кантэксце радковых літар, разрадка, курсіў, тлусты шрыфт), якія, па-першае, дазваляюць падкрэсліць рытміка-меладычны тып вымаўлення, а па-другое, перадаюць эмацыянальна-экспрэсіўныя адценні аўтарскага паведамлення.

Л і т а р а т у р а

1. Дудаков-Кашуро, К. В. Экспериментальная поэзия в западноевропейских экспериментальных течениях начала XX века: футуризм и дадаизм / К. В. Дудаков-Кашуро. – Одесса, 2003. – 128 с.